Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ЛЮТАГА 2016 г. ПЯТНІЦА № 37 (28147) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Медыцына анлайн для сельскіх жыхароў**

СТАР. 4



**Наперад у мінулае са здымачнай групай**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# У СФЕРЫ АГУЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ

## НАЙВАЖНЕЙШЫ ПРЫЯРЫТЭТ У РАБОЦЕ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ — УСЕБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА ДЗЕЛЯ ДАБРАБЫТУ НАРОДАЎ

**Учора ў Мінску прайшло пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі пад старшынствам кіраўніка нашай краіны Аляксандра Лукашэнкі. На парадак дня пасяджэння ВДС было вынесена больш за дзясятак актуальных пытанняў.**

— Мы дамаўляліся Вышэйшы дзяржсавет падрыхтаваць сур'ёзна, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы пасяджэнне. — На этапе падрыхтоўкі мы правялі ўсе належныя мерапрыемствы. Мы тройчы з Уладзімірам Уладзіміравічам абмяркоўвалі пытанні па тэлефоне, двойчы сустракаліся, апошні раз у Сочы, нашы прэм'еры былі ў кантакце. Мы старанна падрыхтавалі ўсе пытанні, вывучылі іх.

Прэзідэнт Беларусі падзякаваў свайму расійскаму калегу за падтрымку і за дапамогу, якую суседняя краіна нам аказвае.

— Мы вельмі рады быць у Беларусі, сапраўды, нашы каманды добра папрацавалі, — адзначыў у сваю чаргу Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. — Мы ведаем, у якім свеце мы жывём, што адбываецца ў сусветнай эканоміцы, у нашай. Нямала пытанняў патрабуюць нашай асаблівай увагі, прычым на найвышэйшым узроўні. У цэлым, хацеў бы адзначыць, што ўсё, што пачалося роўна 20 гадоў таму — я маю на ўвазе пачатак будаўніцтва Саюзнай дзяржавы — не страчана, наадварот, гэты інтэграцыйны праект паспяхова развіваецца, і, безумоўна, у пэўнай ступені становіцца драйверам інтэграцыйных працэсаў на ўсёй постсавецкай прасторы.

Расійскі Прэзідэнт звярнуў увагу, што менавіта лідар нашай краіны стаяў ля вытокаў стварэння Саюзнай дзяржавы.

— Я хацеў бы вам асобна падзякаваць, таму што менавіта з вас і Барыса Мікалаевіча Ельцына гэты працэс быў пачаты, — звярнуўся ён да Аляксандра Лукашэнкі. — Сёння мы маем магчымасць зрабіць наступныя крокі ў развіцці нашых асаблівых адносін.



Фота БЕЛТА.

Саюзнае будаўніцтва Беларусь і Расія вядуць у няпростых умовах. «Нашу інтэграцыю выпрабоўваюць на трываласць глабальная эканамічная нестабільнасць, крызіс даверу ў міжнародных адносінах, эскалацыя ўзброеных канфліктаў і абвастрэнне інфармацыйных войнаў», — адзначыў беларускі лідар.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сітуацыя, якая склалася, не павінна ўплываць на расстаноўку прыярытэтаў у рабоце Саюзнай дзяржавы. І важнейшы з іх — усебаковае супрацоўніцтва дзеля дабрабыту народаў. На яго думку, асновай інтэграцыі працягвае заставацца канструктыўны дыялог у палітыцы, эканоміцы, бяспецы, сацыяльнай і культурнай сферах.

— Упэўнены, што для гэтага ў нас ёсць усе ўмовы. Нядаўна, сустракаючыся з Прэзідэнтам Расіі ў Сочы, мы пацвердзілі наша імкненне ўмацоўваць беларуска-расійскае ўзаемадзеянне па ўсіх накірунках, вырашаць любыя праблемы, што ўзнікаюць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу, што на пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета вынесены найбольш актуальныя пытанні саюзнага будаўніцтва.

— Першаступенная ўвага надаецца эканамічнаму складніку, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. — Патэнцыял двухбаковых эканамічных адносін мы, на жаль, рэалізуем не ў поўнай меры.

— Ужо, на жаль, трэці год адзначаецца падзенне ўзаемнага тавараабароту. У 2015 годзе ён знізіўся больш чым на чвэрць. Гэту негатыўную тэндэнцыю мы можам і павінны пераламіць сумеснымі намаганнямі. Любыя дысбалансы ў стасунках паміж краінамі, няўзгодненасць правядзення эканамічнай палітыкі адчувальныя для нашага ўзаемнага гандлю.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сітуацыя ў эканоміцы склалася няпростая, але былі часы яшчэ горшыя. За апошнія гады ў краіне ўдалося стварыць магутную базу, тэхналогіі, кіруемую эканоміку. Пры гэтым павінна быць разумная арганізацыя працы, эфектыўнае кіраванне і вядзенне гаспадаркі. Для такой работы на месцах дадзены ўсе неабходныя паўнамоцтвы. Нам трэба знайсці кропкі росту эканомікі, прыцягнуць максімальную колькасць замежных інвестыцый у рэгіёны, ствараць новыя прадпрыемствы, больш актыўна развіваць малы і сярэдні бізнес».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.02.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21648,00 | ▼ |
| Еўра | 23868,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 283,55 | ▲ |
| Укр. грыўня | 790,94 | ▼ |

■ Класныя навіны

# АД СІСТЭМ ВІДЭАНАЗІРАННЯ — ДА «ЭЛЕКТРОННАЙ ШКОЛЫ»

**У 2016 годзе ў Мінскай вобласці будуць уведзены ў строй тры новыя ўстановы адукацыі — сярэдняя школа і два дзіцячыя садкі.**

— 1 верасня павінна адкрыцца сярэдняя школа на 510 месцаў у пасёлку Нарач Мядзельскага раёна, — паведаміла **начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна КАЗАК.** — Зараз вядзецца будаўніцтва дзіцячага садка ў вёсцы Ляскоўка, якая адносіцца да Бараўлянскага сельсавета Мінскага раёна. Увод у эксплуатацыю гэтага аб'екта таксама запланаваны на бягучы год. А ў найбліжэйшы час адбудзецца адкрыццё дзіцячага садка на 230 месцаў у Барысаве — па ім ужо падпісаны акт уводу ў эксплуатацыю.

Усяго ў Мінскай вобласці з 2015 да 2020 года было запланавана пабудаваць 12 дзіцячых садкоў. У трох з іх адукацыйны працэс распачаўся яшчэ летась.

СТАР. 3

■ Надвор'е

# СОНЕЧНЫЯ ВЫХАДНЫЯ

## Гэты люты стане на 7-8 градусаў цяплейшым за кліматычную норму

**Апошнія дні каляндарнай зімы павінны стаць не толькі цёплымі, але і сапраўды камфортнымі, паведамляюць спецыялісты аддзела доўгатэрміновых прагнозаў Беларускага гідраметцэнтра. Аднак, пачатак сакавіка можа стаць экстрэмальным у сэнсе надвор'я...**

Праўда, яшчэ ў пятніцу на тэрыторыю краіны завітае атмасферны фронт, які перамяшчаецца з паўднёвага захаду Еўропы. Таму ў другой палове дня на большай частцы тэрыторыі пройдуць ападкі (у асноўным — мокры снег), а потым у некаторых раёнах чакаецца наліпанне мокрага снегу. Максімальная тэмпература паветра складзе ад нуля да 6 цяпла.

У выхадныя кіраваць надвор'ем у нас будзе зона павышанага атмасфернага ціску, таму чакаецца цалкам камфортнае надвор'е.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

16037>

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# У СФЕРЫ АГУЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пра гэта мы таксама толькі што вялі дыялог. Таму ліквідацыя бар'ераў, забеспячэнне эфектыўнага функцыянавання адзінага рынку тавараў, паслуг, капіталаў, а таксама ўзаемная падтрымка — зоны нашых агульных інтарэсаў, падкрэсліў беларускі лідар.

На пасяджэнні абмяркоўвалася таксама выкананне намечаных прыярытэтных кірункаў і задач развіцця Саюзнай дзяржавы на сярэднетэрміновую перспектыву.

— Вызначыўшы іх год таму, мы павінны выразна разумець, дзе прасунуліся наперад, а дзе прабуксоўваем, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуў увагу, што вядучыя дзяржавы свету, краіны-суседзі ўдзяляюць пільную ўвагу знешнепалітычнай актыўнасці Беларусі і Расіі, ваенным аспектам супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў.

— Разгляд і зацвярджэнне праграм узгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў-удзельніц Саюзнай дзяржавы на 2016-2017 гады яшчэ адно з самых актуальных пытанняў на парадку дня, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. — Нам неабходна ў поўнай меры ўлічыць вопыт эфектыўнай работы ў рамках выканання мінулага аналагічнага дакумента. Ваенна-палітычныя крызісы, вяртанне шэрагу краін да «блокавага» мыслення, паўсюднае выкарыстанне санкцый як інструмента палітычнага ціску прымушае нас «трымаць порах сухім».

Менавіта з гэтых прычын асаблівая ўвага на ўчарашнім пасяджэнні была ўдзелена абароннаму будаўніцтву.

— У цэлым галоўная задача — максімальна задзейнічаць усе пляцоўкі і фарматы нашай працы для далейшага развіцця супрацоўніцтва і прыняць эфектыўныя рашэнні, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін адзначыў, што Расія настроена і далей паслядоўна рухацца па шляху ўзаемавыгаднай раўнапраўнай інтэграцыі з Беларуссю ў агульнай Саюзнай дзяржаве. «Паспяховы беларуска-расійскі вопыт спрыяў і спрыяе развіццю інтэграцыйных працэсаў на ўсёй прасторы СНД. Наяўныя напрацоўкі актыўна выкарыстоўваліся пры стварэнні Мытнага саюза, Адзінай эканамічнай прасторы і, нарэшце, Еўразійскага эканамічнага саюза», — нагадаў расійскі Прэзідэнт. Ён лічыць, што больш высокую аддачу для развіцця гаспадарчых сувязяў можа прынесці міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. У 2015 годзе Беларусь наведалі больш за 40 дэлегацый расійскіх рэгіёнаў. Уладзімір Пуцін падзякаваў беларускаму калегу за тое, што ён надае гэтаму напрамку супрацоўніцтва вялікую ўвагу, і пацвердзіў свае планы прыняць удзел у III Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе ў Мінску ў чэрвені.


Фота БЕЛТА.

Бюджэт Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі на гэты год быў зацверджаны ў памеры больш чым 6 мільярдаў расійскіх рублёў, паведаміў Прэзідэнт нашай краіны ў выніковай заяве пасля пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета. Аляксандр Лукашэнка лічыць гэта важным рашэннем у сённяшняй складанай эканамічнай сітуацыі. Гэтыя грошы ў асноўным пойдуць на выкананне саюзных праектаў і праграм.

— Час, гісторыя ўсё расстаўляюць на свае месцы, і мы яшчэ мацней усведамляем каштоўнасць беларуска-расійскага сяброўства, — адзначыў беларускі лідар. — Мы мелі рацыю, калі захавалі праект Саюзнай дзяржавы, на якой мы адпрацоўваем многія пытанні, што могуць быць карыснымі любой інтэграцыі — у тым ліку і нашай у ЕАЭС.

Па словах кіраўніка нашай краіны, падчас пасяджэння былі разгледжаны ўсе актуальныя пытанні, што тычацца розных кірункаў саюзнага супрацоўніцтва.

— Найважнейшае пытанне — вынікі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі за мінулы год. Сапраўды, мы знаходзімся пад уплывам знешніх пагроз нашым эканомікам. Пра прычыны тут няма сэнсу казаць — яны ўсе вядомыя, але мы прыйшлі да агульнага разумення, што сёння павінны сумесна, яшчэ ў больш шчыльнай звязцы ўдзяляць як мага больш увагі пытанням эканомікі і прыкладаць максімум намаганняў для нарошчвання ўзаемнага тавараабароту, умацавання кааперацыйных сувязяў, фарміравання адзінай прамысловай палітыкі, ліквідацыі бар'ераў і выключэнняў на адзіным рынку, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На пасяджэнні ВДС разгледжаны таксама ход выканання Прыярытэтных кірункаў і першачарговых задач далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы на сярэднетэрміновую перспектыву (2014—2017 гады). Паводле слоў беларускага лідара, вызначаны дакладныя арыенціры для далейшых крокаў, накіраваных на захаванне станоўчай дынамікі саюзнага будаўніцтва.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Прадукцыйны фармат

**Беларусі і Расіі трэба шукаць новыя супольныя кропкі для эканамічнага росту. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ на сустрэчы са сваім расійскім калегам Дзмітрыем МЯДЗВЕДЗЕВЫМ, паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Андрэй Кабякоў канстатаваў, што вынікі мінулага года не могуць задавальняць бакі з пункту гледжання аб'ёмаў узаемнага гандлю, выяўленага ў замежнай валюце. «І ўсё ж эканамічныя сувязі не разбураны, яны развіваюцца», — заявіў ён. Кіраўнік беларускага ўрада адзначыў, што ёсць новыя магчымасці для эканамічнага росту. «План мерапрыемстваў урадаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па стварэнні дадатковых умоў для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, які мы год назад падпісалі, спрацаваў», — заўважыў Андрэй Кабякоў.

«Я хачу адзначыць, што, нягледзячы на тое, што нашы дзве краіны з'яўляюцца заснавальнікамі Еўразійскага эканамічнага саюза, Саюзная дзяржава заусёды была тым фарматам, у якім адпрацоўваліся найбольш складаныя, запатрабаваныя пытанні эканомік нашых краін і нашых партнёраў», — заявіў беларускі прэм'ер-міністр. Па яго меркаванні, дамоўленасці, да якіх прыходзяць Мінск і Масква, «могуць быць скарыстаны нашымі партнёрамі для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў Еўразійскім эканамічным саюзе».

У сваю чаргу Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў, што Расіі і Беларусі трэба скаардынаваць сумесную эканамічную палітыку. Па яго словах, трэба пазначыць контуры развіцця падзей у двухбаковых кантактах на будучыню.

# «САВЕТ» ДЫ СЯБРОЎСТВА

**«Мы вельмі даражым тымі давернымі адносінамі, якія склаліся паміж Саветам Федэрацыі і Саветам Рэспублікі, і імкнёмся, каб гэта трансфармавалася ў канкрэтныя праекты», — заявіў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі падчас сустрэчы з кіраўніком Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянцінай МАЦВІЕНКА.**

Спікер верхняй палаты расійскага парламента прыбыла ў Беларусь для таго, каб узяць удзел у пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы. Але напярэдадні гэтага завітала да свайго калегі. Валянціна Іванаўна выказала салідарныя з меркаваннямі беларускага парламентарыя думкі, што, як кіраўнікі палат, яны мусяць наладжваць супрацоўніцтва і тым самым паляпшаць дабрабыт жыхароў сваіх краін.

— Асобна ў кожнай дзяржаве вельмі складана выжываць у гэты няпросты час, — лічыць старшыня Савета Федэрацыі. — Дзякуючы сумеснаму інтэграцыйнаму супрацоўніцтву і аб'яднанню патэнцыялу нашых краін, павышаецца і ўстойлівасць нашых эканомік. І гэта адбіваецца на ўзроўні жыцця жыхароў як Беларусі, так і Расіі.

Валянціна Мацвіенка таксама выказала агульнае задавальненне тым, як развіваюцца расійска-беларускія адносіны. «Паступальна, канструктыўна, па ўзыходнай лініі, — падкрэсліла яна і дадала: — Варта, каб тыя дамоўленасці, якія дасягаюцца на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, безумоўна выконваліся органамі выканаўчай улады і былі пад кантролем парламентаў Беларусі і Расіі».

Сёння Савет Федэрацыі і Савет Рэспублікі актыўна спрыяюць і развіццю міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, пра што сведчыць правядзенне трэцяга форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які мусіць адбыцца ў чэрвені. Па словах спікера верхняй палаты расійскага парламента, сумесная праца суб'ектаў Расійскай Федэрацыі і рэгіёнаў Беларусі «дае добрую практычную аддачу».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Меркаванне

# ЭКАНОМІЯ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

**Як павысіць эфектыўнасць прадпрыемства? Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №78 засяроджвае ўвагу кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый на паслядоўным увасабленні неабходных мерапрыемстваў у жыццё. Дырэктар Гомельскага райжылкамгаса Сяргей МІЦУРА мяркуе, што рэалізацыя запланаваных на 2016 год мерапрыемстваў дазволіць значна знізіць затраты.**

— У нас распрацаваны комплекс мерапрыемстваў па энергазберажэнні і мы імкнёмся іх выконваць. У нас на балансе каля 188 км цеплапасцяк, і штогод мяняем на сучасныя 8 км. Да таго ж, меншым становіцца сабекошт адной гігакалорыі — гэта звязана з пераходам на мясцовыя віды паліва. Каля 70% кацельных працуюць менавіта на мясцовых відах паліва. Яно на парадак таннейшае ў параўнанні з прыродным газам, які закупляецца за мяжой. Восем кацельных працуюць на дранцы. Мы купілі спецыяльную ўстаноўку, якая здрабняе драўніну, таму сабекошт дранкі за кубаметр у нас складае 150 тысяч рублёў, а то і танней. А напрыклад у лясгасе яна цяпер каштуе 220 тысяч рублёў за кубаметр.

Імкнёмся імгненна рамантаваць і разрывы водаправодных і цеплацясак, каб не было ўцечак. У жыллёвым фондзе ўсталёўваем прыборы ўліку цяпла. Да таго ж, уцяпляем жылфонд. Адбываецца замена прыбораў асвятлення на энергаэфектыўныя.

На балансе прадпрыемства каля 287 км водаправодных сетак — за ўласныя сродкі мы штогод мяняем да 2000 м, на свідравінах замяняем помпы на энергаэфектыўныя.

Аўтаматызацыя вытворчых працэсаў дазволіла аптымізаваць колькасць супрацоўнікаў. Гэта таксама ўрэшце паўплывае на сабекошт паслуг. Усе гэтыя меры разам дазваляюць нам знізіць затраты на 20%. Вядома ж, чым меншыя страты нясе прадпрыемства, тым таннейшая будзе паслуга для насельніцтва.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# ТРЭБА МЯНЯЦЬ ПАДЫХОДЫ

**Пра інвестыцыі, дыверсіфікацыю рынка і патэнцыял вобласці расказаў журналістам падчас прэс-канферэнцыі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.**

— Мы павінны вучыцца працаваць у новых эканамічных умовах, — падкрэсліў кіраўнік вобласці ў самым пачатку размовы. — Для гэтага прыйдзецца мяняць падыходы і настройвацца на вынік, а не займаць пазіцыю чакання.

Губернатар звярнуў увагу на тое, што працоўныя калектывы сёння павінны арыентавацца на вынік, рабіць стаўку на экспарт і зніжэнне выдаткаў. Трэба абараняць свой рынак і асвойваць новыя віды прадукцыі. Што датычыцца стратных прадпрыемстваў, то тут павінны прысутнічаць розныя формы падтрымкі, у тым ліку такія, як кропкавая дзярждапамога, прэферэнцыі, санацыя. Вялікія магчымасці адкрываюць новыя рынкі збыту. У вобласці ёсць прадпрыемствы, якія наўпрост працуюць з ЗША, Італіяй, Японіяй. Але Расія па-ранейшаму застаецца адным з галоўных партнёраў, паспяхова працуюць сумесныя прадпрыемствы.

Магілёўшчына — адна з нямногіх у краіне абласцей, якая выканала летась заданне па прыцягненні прамых замежных інвестыцый. Праз СЭЗ «Магілёў» рэалізуюцца значныя праекты, ствараюцца новыя працоўныя месцы. Цікавасць да вобласці праяўляюць Венгрыя, Літва, Чэхія, Польшча. Добрыя ўмовы для вядзення бізнесу створаны ў раёнах, якія трапілі ў праграму развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна. З пачатку дзеяння адпаведнага ўказа тут створана 28 прадпрыемстваў. Яны невялікія, але сэнс у тым, каб гэтыя ініцыятывы працавалі. Кожны з 7 задзейнічаных у праграме раёнаў размясціў на сваіх сайтах інфармацыю пра найбольш прывабныя месцы для вядзення бізнесу. У тутэйшых жыхароў ёсць добрая магчымасць выступіць з ініцыятывай і яе рэалізаваць.

Уладзімір Даманеўскі звярнуў увагу на тое, што Магілёўшчына, як прамысловы рэгіён, мае добрыя ўмовы для развіцця навукова-практычнага патэнцыялу. Паспяхова ўкараняюцца навуковыя распрацоўкі Беларуска-расійскага ўніверсітэта, Беларускай сельгасакадэміі ў Горках.

У вобласці працягваецца будаўніцтва сацыяльна важных аб'ектаў, адкрываюцца фізкультурна-аздараўленчыя комплексы. Карэспандэнт «Звязды», дарэчы, пацікавілася, на якім этапе знаходзіцца будаўніцтва моста ў Слаўгарадскім раёне. Пра яго неабходнасць гаворка ішла яшчэ некалькі гадоў таму, а летась, падчас наведвання гэтага раёна, Прэзідэнт краіны даў даручэнне разгледзець перспектывы яго будаўніцтва.

— Гэты аб'ект запісаны ў праграму развіцця дарожнай сеткі Беларусі, — пракаментаваў пытанне Уладзімір Даманеўскі. — Складанасць яго будаўніцтва ў тым, што трэба ўзводзіць высокую насып, каб не перашкаджаць суднаходству па рацэ. У гэтай транспартнай звязцы мы зацікаўлены яшчэ і таму, што на Блакітнай крыніцы (помнік прыроды рэспубліканскага значэння) плануецца стварыць добры турыстычны комплекс. Дзякуючы мосту, ён стане больш даступным для патэнцыйных наведвальнікаў. Плануем пачаць будаўніцтва ўжо ў чацвёртым квартале гэтага года.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# РЭАЛЬНЫ, ПРАГМАТЫЧНЫ ПАДЫХОД

## Для павышэння эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу патрэбна мабілізацыя ўсіх рэсурсаў

**Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр КОСІНЕЦ на пасяджэнні Мінскага аблвыканкама, дзе разглядаліся пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінскай вобласці за 2015 год, а таксама за апошнюю пяцігодку, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аляксандр Косінец нагадаў, што 23 лютага кіраўнік дзяржавы падпісаў указ №78. Гэты дакумент вызначыў шэраг першачарговых задач, якія неабходна вырашыць на шляху да павышэння эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу Беларусі. «Галоўнае — гэта мабілізацыя ўсіх існуючых рэсурсаў, эфектыўная работа прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, правільная арганізацыя і кіраванне ўсёй эканомікай краіны, — сказаў Аляксандр Косінец. — Ва ўмовах сацыяльна арыентаванай эканомікі неабходна забяспечыць абарону інтарэсаў грамадзян. Важны рэальны, прагматычны падыход да выканання бюджэту. Зыходзячы з гэтага, неабходна адказаць на пастаўленыя пытанні: якія мэты і канкрэтныя задачы для рэалізацыі».

# АД СІСТЭМ ВІДЭАНАЗІРАННЯ — ДА «ЭЛЕКТРОННАЙ ШКОЛЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Што датычыцца будаўніцтва ў найбліжэйшай перспектыве сярэдніх школ, то ўпраўленне адукацыі Мінаблвыканкама сфарміравала свае прапановы. Трэба, каб яны прайшлі ўзгадненне і былі зацверджаны аб'ёмы фінансавання. Напрыклад, у гэтым годзе павінны быць выкананы праектныя работы па школе на 720 месцаў у Мінскім раёне, будаўніцтва якой плануецца распачаць у 2017 годзе», — паведаміла Галіна Казак.

Па словах начальніка абласнога ўпраўлення адукацыі, за 2011—2015 гады ў Мінскай вобласці было пабудавана 11 дзіцячых садкоў на 2043 месцы, праведзена рэканструкцыя і перапрафіляванне дзевяці аб'ектаў на 518 месцаў. Таксама ў Мінскім раёне ў 2015 годзе былі адкрыты два прыватныя дзіцячыя садкі. «Усяго на будаўніцтва і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі за 2011—2015 гады накіравана больш як 2 трлн рублёў, — канстатавала Галіна Казак. — За той жа перыяд адкрыта 10 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, а колькасць дзяцей, уладкаваных на сямейныя формы выхавання, вырасла з 80,6% да 85,85%».

Таксама да канца года плануецца завяршыць працу па абсталяванні сістэмамі відэаназірання абсалютна ўсіх устаноў адукацыі ў вобласці. Галіна Казак упэўнена, што з сістэмамі відэаназірання навучальныя ўстановы сталі больш абароненымі. Яна адзначыла, што ў буйных школах сталічнага рэгіёна з колькасцю 700 і больш вучняў з 2013 года, акрамя відэаназірання, усталяваны яшчэ і электронныя прапускныя сістэмы. У менш буйных школах практыкуюцца толькі сістэмы відэаназірання, што дазваляе кантраляваць сітуацыю як звонку будынка, так і ўсярэдзіне. «Тэхнічныя сродкі дысцыплінуюць не толькі навучэнцаў, але і наведвальнікаў школ», — падкрэсліла начальнік упраўлення.

Да пачатку новага навучальнага года плануецца завяршыць рэалізацыю яшчэ аднаго важнага праекта — па стварэнні безбар'ернага асяроддзя ва ўстановах адукацыі. Для гэтага неабходна абсталяваць яшчэ 25 пандусаў. Летась у школах сталічнага рэгіёна такая праца праводзілася вельмі актыўна — усяго было абсталявана 398 пандусаў. А ў Дзяржынску быў адкрыты дзіцячы сад з безбар'ерным асяроддзем.

Таксама ў 2016 годзе ў Мінскай вобласці плануецца падключыць да праекта «Электронная школа» 112 устаноў адукацыі. Гэты праект будзе рэалізаваны пры падтрымцы Міністэрства адукацыі сумесна з РУП «Белтэлекам». А ў 2017 годзе да праекта далучацца яшчэ 19 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Мінскай вобласці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# СОНЕЧНЫЯ ВЫХАДНЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы на суботу па паўднёвым усходзе, а ў нядзелю ў дзень у паўднёва-заходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя ападкі (мокры снег і дождж). Уначы і раніцай на асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Уначы стане халадней, калі тэмпература паветра складзе мінус 2-7 градусаў, а месцамі, у асноўным па паўночным усходзе, чакаецца нават да 10 марозу, удзень будзе ад нуля да плюс 5 градусаў.

У першыя дні наступнага тыдня надвор'е пачне мяняцца і зноў стане цяплей. У панядзелак наша краіна трапіць пад уплыў малаактыўнага франтальнага раздзелу, які змяшчаецца з паўднёвага захаду Еўропы. Месцамі чакаюцца кароткачасовыя ападкі. У некаторых раёнах магчымыя туман і галалёд, а ўначы і раніцай на дарогах захаваецца галалёдзіца. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла. Удзень чакаецца ад нуля да плюс 5 градусаў, а па поўдні — месцамі да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першыя дні сакавіка надвор'е падкіне нам не вельмі прыемны сюрпрыз у выглядзе сур'ёзнай порцыі мокрага снегу.

**УВАГА!** У аўторак і сераду будуць гаспадарыць атмасферныя франты, якія рухаюцца з боку Балканскага паўвострава. **У аўторак амаль паўсюдна чакаюцца ападкі (мокры снег і дождж), месцамі прагназуюцца моцныя ападкі.** Уначы і раніцай у некаторых раёнах магчыма наліпанне мокрага снегу, галалёд, а на дарогах галалёдзіца. Удзень месцамі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Вельмі складаны тэмпературны рэжым магчымы менавіта ўначы, калі прагназуецца ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Удзень вясна пачне гаспадарыць напоўніцу і будзе плюс 1-8 градусаў, а па поўдні — да 10 цяпла.

Сіноптыкі падлічылі, што люты сёлета выдаўся па-вясноваму цёплым. Сярэдняя тэмпература паветра за месяц склала ад нуля на ўсходзе да 3 цяпла на паўднёвым захадзе, што на 7-8 градусаў вышэй за кліматычную норму. Такі тэмпературны рэжым характэрны для апошніх дзён сакавіка. Быў люты багатым і на ападкі, бо па выніках месяца на большай частцы тэрыторыі краіны выпала паўтары месячныя нормы, а месцамі колькасць ападкаў дасягнула дзвюх лютаўскіх нормаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ А вы чулі?

# ХУТКІ, ЯК... БЕЛАРУСКІ ІНТЭРНЭТ!

**Яшчэ не так даўно хуткасць доступу ў інтэрнэт у нашай краіне выклікала жаданне як мінімум саркастычна пажартаваць. Але цяпер усё інакш — Беларусь увайшла ў тройку краін, якія маюць хуткасць інтэрнэт-злучэння ў 1 Гбіт/сек.**

## ЗВЫШХУТКАСЦЬ ПАТРЭБНА ПАКУЛЬ ТОЛЬКІ БІЗНЕСУ

Паводле інфармацыі канадскай кампаніі SecDev Corp, у лідарах «гонкі» таксама ЗША і Швецыя. На чацвёртым месцы размясцілася Канада — там хуткасць абмену дадзенымі склала 940 Мбіт/сек. Для большасці краін найбольш «папулярнай» хуткасцю доступу з'яўляецца 100 Мбіт/сек. Яе забяспечваюць, як правіла, правайдары на нацыянальных рынках. Самы хуткі доступ у інтэрнэт (1 Гбіт/сек. і вышэй) зараз запатрабаваны ў асноўным сярод кампаній. Абмен дадзенымі ў Еўропе знаходзіцца на ўзроўні не больш за 600 Мбіт/сек. У Літве і Іспаніі доступна злучэнне на хуткасці 300 Мбіт/сек, у Германіі і Латвіі — 400 Мбіт/сек. Самыя нізкія хуткасці ў Арменіі — 40 Мбіт/сек., Славеніі — 15 Мбіт/сек., Таджыкістане — 1 Мбіт/сек. Беларускія правайдары адзначаюць, што нягледзячы на хуткасць айчыннай сеткі, увесь яе патэнцыял яшчэ цалкам не выкарыстоўваецца. Адной з перашкод з'яўляецца тое, што ў глабальнай сетцы недастаткова сервераў, здольных абменьвацца дадзенымі на хуткасці ў 1 Гбіт/сек. Увайсці ў тройку лепшых Беларусі дазволіла масавае выкарыстанне дзвюх найбольш актуальных тэхналогій перадачы дадзеных для камп'ютарных сетак — Ethernet і xPON.

## У РАЗВІТЫХ КРАІНАХ — УСЁ БОЛЬШ СМАРТФОНАЎ



Паводле даследаванняў кампаніі Pew Research Center, у краінах з развітой эканомікай імкліва расце колькасць людзей, якія выкарыстоўваюць інтэрнэт — з 45% дарослага насельніцтва ў 2013 годзе да 54% — у 2015 годзе. Уладальнікаў смартфонаў таксама стала больш — 37% насельніцтва (21% два гады таму). Асноўны рост паказчыкаў за мінулыя два гады забяспечылі такія краіны, як Малайзія, Бразілія і Кітай. Лідзіруе па гэтых паказчыках Паўднёвая Карэя з 95% насельніцтва, якое карыстаецца інтэрнэтам, і 88% — смартфонамі. Сярод карыстальнікаў пры гэтым асаблівую папулярнасць мае сацыяльныя сеткі.

Па звестках Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі, на 1 студзеня 2016 года ў краіне налічваецца каля 2,8 мільёна карыстальнікаў стацыянарнага шырокапалосага доступу. Паводле ацэнак Міжнароднага саюза электрасувязі, у Беларусі ў 2014 годзе на 100 жыхароў прыходзілася 28,8 абанента стацыянарнага шырокапаласога доступу (для параўнання — у 2010 годзе гэты паказчык складаў 17,4 на 100 жыхароў). Доля смартфонаў на рынку Беларусі таксама пастаянна расце. Паводле інфармацыі кампаніі Lenovo, у 2013 годзе колькасныя суадносіны смартфонаў да кнопкавых тэлефонаў складалі 49% супраць 51%, у 2014-м — 69% да 31%, а ў 2015-м — 76% да 24% адпаведна.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

■ Стаўкі

# КАЗІНО «ЎЛЯЦЕЛА» НА ПАДАТКІ

**З першых дзён студзеня нормамі артыкула 309-га асаблівай часткі Падатковага кодэкса Беларусі вызначаюцца новыя стаўкі падатку на ігральны бізнес, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па гораде Мінску.**

Заўважу, што ў ігральным бізнесе на кожны аб'ект існуе свая асобная падатковая стаўка. Так, самая маленькая сума падатку ў памеры 2,4 млн рублёў за месяц вызначана для ігральнага аўтамата. Крыху больш за 6,5 млн рублёў у месяц будзе абыходзіцца арганізатарам каса букмекерскай канторы, а каса таталізатара — 13 млн рублёў. Больш за астатніх у казіно «важыць» ігральны стол, за які ў месяц неабходна будзе пералічыць у бюджэт ажно 63 млн 418 тысяч рублёў падаткаў. Але і гэта яшчэ не ўсе выдаткі для арганізатараў розных рулетак.

Цяпер неабходна будзе заплаціць падатак на ігральны бізнес па дадатнай розніцы паміж сумай прынятых ставак у азартных гульнях і сумай выплачаных выйгрышаў. А стаўка такога падатку складае 4%. А яшчэ спецыялісты гарадской падатковай службы паведамляюць, што сёлета ўладальнікі казіно (юрасобы) павінны падаваць у мясцовую інспекцыю падатковую дэкларацыю за мінулы месяц па падатку на ігральны бізнес не пазней за 20-е чысло гэтага месяца. А аплаціць такія падаткі неабходна ўжо да 22-га.

Увогуле, у сістэме аплаты падаткаў на ігральны бізнес з недысцыплінаванымі кліентамі размова атрымліваецца даволі кароткай і жорсткай. Згодна з палажэннем аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці, якое зацверджана Указам кіраўніка дзяржавы ад 1 верасня 2010 года № 450, своечасовая аплата падатку на ігральны бізнес лічыцца ліцэнзійным патрабаваннем і ўмовай, якая прад'яўляецца да ліцэнзіята. Пры гэтым няплата (няпоўная аплата) падатку на ігральны бізнес на працягу 2 месяцаў запар з'яўляецца падставай для прыняцця рашэння аб спыненні дзеяння ліцэнзіі. Тут пазіцыя дзяржавы да казіно цалкам зразумелая: як толькі нехта забывае аплаціць падаткі, то ён адразу губляе ліцэнзію.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ІНАВАЦЫЙНЫ КЛАСТАР ТРАПІЦЬ «ПАД КРЫЛО» ПАРКА ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Новы інавацыйны кластар можа быць створаны ў якасці структурнага падраздзялення на тэрыторыі Мінскага вытворчага аб'яднання вылічальнай тэхнікі. «Цікавасць да тэрыторыі Мінскага завода вылічальнай тэхнікі ёсць. Зараз у стадыі абмеркавання знаходзіцца праект па стварэнні там інавацыйнага кластара», — адзначыў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэй ГАЕЎ.**

Кіраўнік Дзяржкаммаёмасці ўдакладніў, што каардынацыю дзейнасці кластара плануецца перадаць Парку высокіх тэхналогій. Цяпер працягваецца абмеркаванне праекта зацікаўленымі органамі. У камітэце спадзяюцца, што найбліжэйшым часам абмеркаванне завершыцца і «мы зможам выйсці на ўнясенне канкрэтных прапаноў па засваенні гэтых тэрыторый», — падкрэсліў Андрэй Гаеў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## НЯМА ПАСАЖЫРАЎ — НЯМА РЭЙСАЎ

**У сувязі з нязначным пасажырапатокам дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» прыпыніла выкананне рэгулярных рэйсаў па некаторых міжнародных маршрутах.**

Так, гаворка ідзе пра наступныя маршруты: Мінск — Друскінінкай адпраўленнем з нашай сталіцы ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 6.50, з Друскінінкая ў 16.00 — па суботах з 19 сакавіка; Мінск — Масква адпраўленнем з Мінска ў 8.30 — па суботах з 27 лютага, у 23.30 — з 9 сакавіка, з Масквы ў 10.30 — па нядзелях з 28 лютага, у 23.30 — з 10 сакавіка; Мінск — Талін адпраўленнем з нашай сталіцы ў 14.30 — па пятніцах з 27 сакавіка, з Таліна ў 16.00 — па суботах з 27 сакавіка.

## І «БЫЧОК» ПАДКАЖА, ЯК ЗНАЙСЦІ БРАКАНЬЕРА

**Устанавіць асобу парушальніка сёння можна нават па недакурку, пакінутым ім на месцы злачынства.**

— Менавіта такі доказ выявілі работнікі Мінскай міжрайінспекцыі на месцы незаконнай здабычы лася ў Пухавіцкім раёне. Пакінуўшы крыміналістам іх працу, дзяржінспектары па «гарачых слядах» пагутарылі з мясцовым егерам. Той паведаміў, што напярэдадні да яго прыязджалі два паляўнічых. Арганізаваць для іх тур у той дзень не атрымалася, але ж, магчыма, азарт узяў верх над здаровым сэнсам. Мужчыны патрапілі пад падазрэнне, — распавяла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Наступнай кропкай візіту дзяржінспектараў стаў адрас у пасёлку Сокал, дзе была зарэгістравана зброя аднаго з паляўнічых. Там іх сустрэлі бацькі падазраванага і зачынены сейф. Бацькі патлумачылі, што іх сын з жонкай пражываюць у Мінску. Менавіта ў сталічнай кватэры быў знойдзены карабін, які захоўваўся не ў сейфе, і патроны, схаваныя на паліцах пад вопраткай. А фігурант справы бясследна знік, папярэдне вымыўшы паляўнічую вопратку. Знайшлі ў кватэры і мяса дзічыны — восем кілаграмаў замарожанай ласяціны. Апроч гэтага, яшчэ і забароненую рыбалоўную прыладу — сгометровую сетку.

Дарэчы, падчас разбору сітуацыі дзяржінспектары абследавалі і дом егера. Іх увагу прыцягнула бочачка, напоўненая мясам дзіка, як мяркуецца, ад трох асобін. Гэта парушэнне асаблівага рэжыму вымання, захавання і знішчэння гэтых жывёл. Праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Медыцына і тэхналогіі

# ПРЫЁМ У РЭЖЫМЕ АНЛАЙН

## У Магілёўскім раёне сельскіх жыхароў будуць абслугоўваць з дапамогай відэасувязі

**У вобласці гэта першы прыклад, калі раённая ўстанова аховы здароўя зарабіла на сваёй ініцыятыве амаль 18 тысяч долараў. У планах — закупіць камп'ютары з 3G інтэрнэтам, WEB-камеры і навушнікі для ўрачоў і фельчараў і аб'яднаць у адзіную сетку 3 участковыя бальніцы, 6 амбулаторый і 2 ФАПы. Да канца чэрвеня праект павінен быць цалкам рэалізаваны.**



**Вольга МАСОЛЬД і Сяргей КАРАЕЎ шукаюць найбольш прагрэсіўныя метады аказання медыцынскіх паслуг.**

### ІНІЦЫЯТЫВУ НАЗВАЛІ... «ВАСА»

Ініцыятыва запрацавала дзякуючы... уважлівасці галоўнага ўрача магілёўскай паліклінікі №11 Сяргея Караева. Гэта ён зацікавіўся аб'явай у інтэрнэце і прыняў рашэнне паўдзельнічаць у конкурсе ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Беларусі». А натхняльнікам і распрацоўшчыкам стала начальнік гаспадарчай часткі Вольга Масольд. Як чалавек неабыякавы да ўсяго перадавога, яна прыгадала, што некалькі гадоў таму чытала ў інтэрнэце пра работу амерыканскіх медыкаў з насельніцтвам пры дапамозе відэасувязі. Сёння для медыцынскіх устаноў буйных гарадоў Беларусі гэта таксама не навінка, але ж размова ідзе пра вёску. Укараненне тут анлайн-сувязі — інавацыйны і нават у чымсьці дзёрзкі праект.

**Атрымаўшы інваліднасць, страціўшы магчымасць працаваць па спецыяльнасці, чалавек перш за ўсё звяртаецца да нас. І тут адны́мі медыцынскімі паслугамі справы не абмяжоўваюцца.**

Цікава, што для падстрахоўкі пададзена была заяўка на яшчэ адзін, менш амбіцыйны праект, які датычыўся ўстаноўкі на адной з участковых бальніц сонечных батарэй. Але перамагла менавіта «Васа» (так Вольга сімвалічна назвала свой праект з відэасувяззю). У перакладзе з лацінскай гэта «ягадка». Маўляў, пакуль усё, што робіцца, гэта кветачкі, а «ягадкі» будуць потым — у выглядзе больш дакладнай пастаноўкі дыягназаў, і, як следства, зніжэння ўзроўняў захваральнасці і смяротнасці.

На рэалізацыю праекта выдзелены грант на суму каля 18 тысяч долараў і каля 2 тысяч долараў паліклініка гатова ўнесці сама. Спадзяванні на гэты праект вялікія.

— У нас на абслугоўванні 29 тысяч жыхароў Магілёўскага раёна. Каля 30% — гэта пенсіянеры, але павялічваецца і колькасць дзяцей. Сучасныя тэхналогіі дапамогуць нам праводзіць прафілактычную работу, карэкціраваць лячэнне. Мы збіраемся у анлайн-рэжыме праводзіць відэаканферэнцыі з урачамі, якія працуюць на вёсцы, ажыццяўляць кансультацыі. Улічваючы, што там у асноўным маладыя спецыялісты, такі спосаб дачыненняў вельмі неабходны і карысны. Яны змогуць аператыўна звязвацца са сваімі больш вопытнымі калегамі, атрымаць неабходныя звесткі ад вузкіх спецыялістаў. Можна будзе аператыўна перадаваць у электронным выглядзе выпіскі, даведкі. А яшчэ — праводзіць ВКК на адлегласці, калі частка спецыялістаў будзе знаходзіцца на раёне, а частка тут, у горадзе. І людзям не спатрэбіцца лішні раз ехаць да нас, — радуецца будучым магчымасцям Сяргей Караеў.

У планах — паступова ахапіць відэасувяззю ўсе 33 падраздзяленні з ліку бальніц, амбулаторый і ФАПаў.



**Рэгістратура паліклінікі ўжо спрабуе працаваць з электроннымі карткамі пацыентаў па праграме «Лекар».**

Праект будзе ўкараняцца адначасова з пераходам усіх медыцынскіх устаноў на адзіную рэспубліканскую медыцынскую інфармацыйную праграму. У 11-й паліклініцы ўжо камп'ютарызаваны ўсе тэрапеўтычныя і педыятрычныя кабінеты.

### ДОБРЫЯ ПАРТНЁРЫ НЕ ГОРШ ЗА СПОНСАРАЎ

У канцы студзеня Вольга Масольд пабывала ў Мінску на семінары, дзе з пераможцамі конкурсу ПРААН былі заключаны дамовы.

— Трэба скласці падрабязную праграму нашых далейшых дзеянняў, — расказвае Вольга. — Будзе выверацца кожны наш крок, за кожную суму грошай трэба даваць поўную справаздачу. Да 30 чэрвеня праект павінен ужо запрацаваць. У гэтым месяцы мы адкрылі разліковы рахунак, першы транш паступіў.

Партнёрамі па ўкараненні ініцыятывы (іх наяўнасць была абавязковая па ўмовах конкурсу) сталі Магілёўскі тэхнапарк і раённая арганізацыя БРСМ. Тэхнапарк аказаў дапамогу ў падрыхтоўцы ініцыятывы, а моладзь зараз па ўсіх сваіх мерапрыемствах рэкламуе праект. Расказвае, што быць ініцыятыўным сёння — патрабаванне часу. І паліклініка №11 — яскравы прыклад таго, як гэта можа працаваць. «Трэба адсочваць такія прапановы і дзейнічаць, — кажа Вольга Масольд. — Арганізацыі, якія могуць дапамагчы фінансава, размяшчаюць свае ўмовы на сайтах. Я была сведкам таму, як адзін з дамоў-інтэрнатаў Магілёўскай вобласці выйграў грант на адкрыццё майстэрняў для інвалідаў. А нейкі краязнаўца знайшоў такім чынам грошы на выданне кнігі пра свае адкрыцці».

### САЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ АГУЛЬНЫЯ З МЕДЫЦЫНСКІМІ

Самастойна знайсці грошы на рэалізацыю праекта, за які ўзялася раённая паліклініка, сёння не проста. Удзел у конкурсе ПРААН — пакуль што першая спроба вырашыць надзённае пытанне. Пры дэфіцыце сродкаў цяжка бывае не пакрыўдзіць пацыентаў. Але тут імкнуцца знаходзіць залатую сярэдзіну. Такі балючы працэс, як аптымізацыя, таксама праводзіўся з улікам усіх «за» і «супраць». У Семукачах, напрыклад, быў ФАП, а за 4 кіламетры — амбулаторыя. Вырашана было з ФАПа зрабіць амбулаторыю. Семукачы ўсё ж такі цэнтр гаспадаркі, там больш насельніцтва. А летась з Нядашава перанеслі ФАП у Амхавую. Зноў-такі з тых меркаванняў, што там больш насельніцтва. Да таго ж Амхавая знаходзіцца на трасе і даехаць туды спадручней.

**На жаль, ёсць пытанні, якія паліклініка самастойна не можа вырашаць. Парадокс у тым, што ўстанова абслугоўвае сельскае насельніцтва, але фінансуецца з гарадскога бюджэту, бо знаходзіцца на тэрыторыі абласнога цэнтра.**

— Па родзе дзейнасці медыкі заўсёды сутыкаюцца з праблемамі людзей не толькі медыцынскага характару, — кажа Сяргей Караеў. — Атрымаўшы інваліднасць, страціўшы магчымасць працаваць па спецыяльнасці, чалавек перш за ўсё звяртаецца да нас. І тут адны́мі медыцынскімі паслугамі справы не абмяжоўваюцца. Аднаўляем дакументы, нават займаемся пахаваннем. Таму што часцей за ўсё паміраюць адзінокія або кінутыя роднымі людзі. Адарваць медыцыну ад грамадства наогул немагчыма. У нас медыкі пры наведванні сацыяльна небяспечных сямей або адзінокіх старых звяртаюць увагу не толькі на стан здароўя людзей і наяўнасць лекаў, але і на санітарныя ўмовы. Цікавяцца, ці патрэбна дапамога. Калі да нас толькі прыехалі бежанцы з Украіны, мы адны́мі з першых падымалі пытанне, як быць з цяжарнымі жанчынамі. Людзі вымушаны былі ў спешцы кінуць свае дамы, некаторыя нават не мелі сродкаў для існавання. Дзе ім было ўзяць сродкі на тыя ж роды? І мы яшчэ да Указа дапамагалі медыцынскімі паслугамі тым, каму прыйшоў час нараджаць.

На жаль, ёсць пытанні, якія паліклініка самастойна не можа вырашаць. Парадокс у тым, што ўстанова абслугоўвае сельскае насельніцтва, але фінансуецца з гарадскога бюджэту, бо знаходзіцца на тэрыторыі абласнога цэнтра.

— Такое рашэнне было прынятае Саўмінам яшчэ ў 2005 годзе, але гэта не вельмі зручна, — лічыць галоўны ўрач. — Фінансаванне павінна зыходзіць з таго адміністрацыйнага цэнтра, які адказвае за людзей. Магілёўскі райвыканкам гатовы гэта рабіць, але не мае законнай падставы. Нам жа зручней працаваць з раённым бюджэтам. Я кантактую з раённымі службамі — Жылкамгасам, ратавальнікамі, міліцыяй, але мы існуем у розных фінансавых вымярэннях. А маглі б аказваць паслугі не толькі за грошы, але і па ўзаемаразліках.

***Дарэчы, рашэнне стаць дэпутатам Сяргей Караеў прымаў таксама з такім прыцэлам, каб было прасцей вырашаць агульныя праблемы з рознымі зацікаўленымі службамі. Ёсць магчымасць падчас сесій падняць вострыя пытанні, пагутарыць аб выдзяленні сродкаў на папераджальныя мэты. Зараз, напрыклад, паліклініка праводзіць у раёне прафілактычныя меры супраць шаленства сумесна з Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў.***

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з архіва Вольгі МАСОЛЬД**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## МЫТНЯ ДАЕ ДАБРО

**У Магілёве адкрыўся першы на тэрыторыі вобласці транспартна-лагістычны цэнтр «Магілёў-Белмытнясэрвіс».**

Прыгожы будынак на вуліцы Крупскай абяцае стаць цэнтрам для развіцця бізнесу. Тут ёсць усё для таго, каб атрымаць цэлы комплекс паслуг па мытным афармленні і транспартна-лагістычным суправаджэнні паставак. Яго памяшканні аснашчаны сучасным абсталяваннем і высокатэхналагічнай сістэмай кіравання працэсамі. Да паслуг кліентаў халадзільныя камеры для захоўвання грузаў, пагрузачна-разгрузачная тэхніка, упакавачнае абсталяванне. Цэнтр зручна размясціўся не толькі на шляху асноўных транспартных патокаў, але і мае свае чыгуначныя пад'язныя шляхі.

— Сёння лагістычнаму сектару адводзіцца асаблівае месца ў развіцці эканомікі Беларусі, — адзначыў **старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Юрый СЯНЬКО.** — І гэта заканамерна, улічваючы геаграфічнае становішча рэспублікі, якая з'яўляецца мостам у гандлёвых адносінах паміж найбуйнейшымі міжнароднымі рынкамі. Магілёўскі лагістычны цэнтр адпавядае ўсім патрабаванням. Тут усё аптымальна выверана і эфектыўна задзейнічана.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

## БУДЗЕМ НА СУВЯЗІ!

**Кампанія МТС паведаміла аб сваім намеры знізіць цэны на паслугі сувязі ў роўмінгу на тэрыторыі краін — удзельніц Еўразійскага эканамічнага саюза.**

З 1 красавіка 2016 года абаненты аператара падчас знаходжання ў Расіі, Казахстане, Арменіі і Кыргызстане будуць менш плаціць за сувязь.

Краіны ЕАЭС — самыя запатрабаваныя напрамкі сярод кліентаў МТС, якія рэгулярна карыстаюцца роўмінгам за мяжой. На гэтыя чатыры дзяржавы прыпадае амаль 70% выходных выклікаў па краіне знаходжання, а таксама каля 50% усіх уваходных выклікаў і інтэрнэт-трафіку ў роўмінгу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ВІТАЙЦЕ! ВІНШУЙЦЕ! ЖАДАЙЦЕ!

**Павіншаваць блізкіх і знаёмых з любімымі святамі і знамянальнымі падзеямі ў жыцці заўсёды прыемна. Цяпер такое віншаванне можа стаць незабыўным дзякуючы новаму інтэрнэт-сэрвісу «Белпошты».**

Ліст з віншаваннямі ў канверце — выдатная нагода перадаць цёплыя словы падзякі і любові адрасату, а цяпер, у век інфармацыйных тэхналогій, гэта яшчэ і даволі нетрывіяльны спосаб зрабіць прыемнае блізкім, сябрам і калегам.

«Віншаванні са святамі» — унікальны інтэрнэт-сэрвіс, з дапамогай якога любы ахвотны можа афармляць заказ на віншавальны ліст на адрас родных, сяброў або партнёраў да дзяржаўных і прафесійных святаў.

Ліст з пажаданнямі на маляўнічым бланку ў канверце можна адправіць па ўсёй тэрыторыі краіны, а таксама за мяжу.

Для атрымання віншавальнага ліста напярэдадні свята неабходна аформіць заказ не пазней, чым за сем дзён да наступлення свята пры перасылцы па Беларусі. Адправіць віншаванне можна простым або заказным лістом.

Аплаціць заказ можна банкаўскімі аплатнымі карткамі міжнародных плацежных сістэм VISA і MasterCard.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# КАРАВАЙ І ПАВУЧЫНЫЯ КРОСНЫ,

## або Карысныя парады для новага жыцця

**Кожны дзень з'яўляюцца дзясяткі новых музычных кампазіцый розных жанраў. І гэта заканамерна, бо адлюстроўвае тэндэнцыі часу, паказвае, што хвалюе сучасных творцаў. І прыемна канстатаваць, хаця б для сябе, што народная песня, як і класічная музыка, застаецца з года ў год у нас на слыху. Зразумела, аўдыторыя прыхільнікаў тут не настолькі шматлікая. А вось задавальненне і асалода для душы, як мне здаецца, у разы большыя. У вандроўках са здымачнай групай праграмы «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» кожны раз пераконваюся ў гэтым. Не выключэннем стала і падарожжа ў вёску Студзераўшчына Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці, дзе мы пазнаёміліся з мясцовым народным фальклорным калектывам.**



Цяпер у вёсцы 33 двары, і там пражывае 56 чалавек. Мясціны тут прыгожыя і маляўнічыя, а назва населенага пункта, па адной з версій, паходзіць ад слова «студзень», «студзёная», «студзёная вада». Людзі кажуць, што некалі тут шумеў гай, а ўся вёска была быццам пранізана крыніцамі — хоць у любым месцы капай калодзеж. Вада ў гэтых крыніцах была незвычайная: летам — халодная, а зімой цёплая. Таксама некаторыя згадвалі, быццам мела тая вадзіца цудадзейную, лячэбную сілу. І да крыніц прыходзілі не толькі мясцовыя, але і прыезджыя людзі...

**Магчыма, нейкія традыцыі і абрады, калі глядзець на іх сёння, здадуцца не надта патрэбнымі. Але іх сіла грунтуецца найперш на нашай веры.**

Яшчэ вёска славілася тым, што яе жыхары вельмі весяліцца любілі. Спявалі, танцавалі, збіраліся на вячоркі. Жанчыны, якія сёння захоўваюць народныя песні і традыцыі мясцовасці, добра гэта памятаюць.

— Мне ўжо можна не спяваць, але я ўсё роўна гэта раблю. І так 30 гадоў. Мы ўсе з самага заснавання тут спяваем. Наш калектыў арганізоўваўся з пяці чалавек. З часам ён разрастаўся, прычым спявалі ўсе: і жанчыны, і мужчыны. А цяпер мужчын ужо няма, — згадвае адна з удзельніц калектыву Яўгенія Ляўкевіч. — На вечарынкі мы збіраліся па хатах. Цяпер стамляешся, а раней прыйдзем дадому і — бяжым босыя на танцы. Але і пост трымалі перад вялікімі святамі... Цяпер жа ў нас глуш, людзей няма. Толькі паляўнічых хіба што ўбачыш.

Вячоркі ў вёсцы звычайна ладзілі два разы на тыдзень. Па чарзе хлопец шукаў музыканта, а дзяўчына — хату, затым другая пара. Пазней пачалі збіраць для музыкі грошы — хто колькі можа. Звычайна igралі двое — на гармоніку і скрыпцы. Танцавалі польку, вальс, кракавяк, падыспань, страданне. Калі хлопец запрашаў дзяўчыну, то яны танцавалі ў пары, альбо дзяўчаты танцавалі з дзяўчатамі. Вельмі любілі на такія вячоркі прыходзіць жанатыя, каб патанцаваць, пагаварыць і паслухаць, што другія кажуць. Напрыклад, замужнія жанчыны дзяліліся сваімі жыццёвымі клопатамі, раіліся, як ужывацца ў новай сям'і.

*Бяроза мая каранiстая,*
*Свякроўка мая ганарыстая.*
*Пакуль норавы пераведала,*
*Не раз я і не два не паабедала.*
*Свякроўка ліха работу скажа,*
*Сама спаць ляжа:*
*Ой ты, сыночак, каня напасі,*
*А ты, нявестка, вады прынясі...*

У будні дзяўчына бегала па хатах і збірала дзяўчат, каб разам прасці. А хлопцы стараліся залезці пад калаўрот, каб іх не бачылі. Сядзелі і чакалі, калі дзяўчаты разыходзіцца пачнуць. Тады праводзілі дзяўчат дадому і падносілі ім прасніцы. Аднак, мяркуючы па тэкстах песень, што выконваюць тут сёння, не заўсёды дзяўчаты былі шчаслівыя ў каханні:

*Плыві, доля, ты з вадою,*
*А я следам за табою.*
*Прыплылі мы к беражочку*
*Ды паселі на жвірочку.*
*Напісалі па лісточку:*
*«Няхай дома не гаруюць,*
*Мне пасагу не рыхтуюць.*
*Я свой пасаг прагуляла —*
*З казачэнькам размаўляла.*
*З казачэнькам маладзенькім*
*Пад кусточкам зяляненькім...»*

Калі ж дзяўчына сустракала свайго нарачонага, то пачыналі думаць пра вяселле. Напярэдадні падзеі дзяўчына збірала «каравайных» з ліку сваіх сяброўак альбо іх збірала маці з ліку сваіх сваячак. Дзяўчаты цэлую ноч пяклі каравай (нам паказалі гэты абрад). Каб каравай атрымаўся, трэба было не толькі добра ўмець цеста мясіць, а яшчэ і песні спяваць. Перад замесам жанчына, якая рабіла гэта, звярталася да каравайніц, каб атрымаць дазвол на такое дзеянне: «У імя Айца, Сына і Святога Духа... Дазвольце гэты Божы дар замясіць». І ёй адказвалі: «Як Бог дазваляе, і мы дазваляем». І так тройчы. Пакуль замешваўся каравай, гучала песня. (*«Дай, Божа, шчасця, дай, Божа, долі нашаму дзіцятачку».*) Пасля гэтага надыходзіў час «круціць» пышкі, якімі будзе ўпрыгожаны каравай. Кожная каравайніца, узяўшы цеста ў рукі, спявала: *«Свеціць месяц над гумном,/ Круцяць пышкі за сталом./ Круцяць браток з сястрою,/ Ды за светлаю зарою».*

Перш чым зваць маршалка (ён занясе каравай у печ і будзе за ім там назіраць), спявалі песню для найстарэйшай каравайніцы: *«Сама старша каравайначка, сама старша каравайначка/ Ды па полі гарцавала, яна зайца даганяла./ Сама старша каравайначка, сама старша каравайначка/ Паехала ў лес па дровы з кабылкаю сляпенькаю./ Кабылкаю сляпенькаю, дарожкаю крывенькаю./ Дарожкаю крывенькаю, з сякеркаю тупенькаю./ Зачапілася за пень прастаяла цэлы дзень...»*

Дарэчы, маршалак не толькі назіраў за выпяканнем каравая, але таксама разразаў яго на наступны дзень на вяселлі. Гэта абавязкова павінен быў рабіць мужчына.



Як стварэнне новай сям'і, так і пабудова новага дома патрабавалі прытрымлівацца пэўных правіл-рэкамендацый. Для пабудовы хаты нельга было браць вывернутае непагаддзю дрэва, бо лічылася, што гэта зрабіла нячыстая сіла. Не выкарыстоўвалі і тое дрэва, што звісала над ім, бо «хата хутка згарыць». Вопытны селянін ніколі не возьме для будаўніцтва рыплівае дрэва (таму што ў хаце хтосьці памрэ). Калі аблюбаваў месца для будаўніцтва, то трэба на тым месцы паставіць чыгунок з павуком. Як за ноч «сатчэ ён кросны», тады месца выбрана ўдала. Раней на падмурак ніколі не бралі каменне з могілак — інакш увесь час будуць непрыемнасці. Пры будаўніцтве «хаты пад вугал» неабходна было пакласці манеты, хлеб, каб задобрыць дамавіка. А яшчэ пад чатыры вуглы клалі асвячоныя зёлкі альбо хваёвыя галінкі, каб засцерагчы дом ад Перуна. Знойдзеную на двары падкову на хату прыбівалі на шчасце. У новую хату пераходзілі на маладзік, каб раслі гаспадарка і дабрабыт у хаце. Але перад гэтым пускалі ў новую хату пераначаваць пеўня і ката. На наступны дзень перабіраліся гаспадары. Калі ў сям'і ўжо былі дзеці, то іх пускалі першымі. А як першы раз у хату заходзілі суседзі, то неслі з сабой хлеб, каб жыць дружна і ў цяжкую хвіліну не сварыцца. Звычайна на ўваходзіны збіраліся сваякі і блізкія, прыносілі падарункі і казалі пажаданні. Пасля гаспадары запрашалі ўсіх за стол. Так пагулянка працягвалася далёка за поўнач...

Што ні кажыце, але мудрасць старэйшага пакалення — для нас скарб. Магчыма, нейкія традыцыі і абрады, калі глядзець на іх сёння, здадуцца не надта патрэбнымі. Але іх сіла грунтуецца найперш на нашай веры. А чалавек, пакуль верыць, застаецца чалавекам. Акцэнты могуць перастаўляцца, як каму пажадаецца, але аснова — гэта пачатак усяго і ва ўсім.

**Алена ДРАПКО. Фота аўтара.**
*drapko@zviazda.by*

# ШАШКІ

выпуск №7

Бліцконкурс:

Сёння нашым чытачам прапануюцца апошнія тры заданні, складзеныя двухразовым чэмпіёнам Беларусі па шашачнай кампазіцыі Дзмітрыем Камчыцкім (Магілёў).

Пераможца бліцконкурсу атрымае прыз ад аўтара кампазіцый.

№5




№4

**Белыя простыя:** a3, a7, b6, c7, g5, h4 (6).

**Чорныя простыя:** b4, c3, c5, d4, d8, e5, f2, h6 (8).

№5

**Белыя простыя:** b4, d6, e5, e7, f6, g5 (6).

**Чорныя простыя:** a3, a5, c3, d2, h4 (5).

№6

**Белыя простыя:** a3, a5, d6, f6, g1, g7 (6).

**Чорныя простыя:** b6, d8, c3, c7, d2, d4, f4, h8 (8).

У канцы студзеня ў Мінску, у сталічнай СДЮШАР-11, адбыўся традыцыйны турнір па шашках-64 памяці вядомага беларускага майстра Уладзіміра Граковіча. У турніры прынялі ўдзел 48 шашыстаў, сярод якіх 10 майстроў спорту. У выніку напружанай барацьбы да фінішу з аднолькавым вынікам 13 ачкоў з 18 магчымых прыйшлі малады міжнародны майстар Аляксей Куніца і старэйшына беларускіх шашак Аркадзь Плакхін. Каэфіцыент аддаў перавагу маладзейшаму спартсмену. Яшчэ 8 шашыстаў набралі па 12 ачкоў, тут па дадатковых паказчыках на 3-е месца выйшаў юны майстар Дзмітры Немец. Найлепшай у жаночым заліку стала Яна Лазовік — 11 ачкоў.

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, газета «Звязда», e-mail: *info@zviazda.by* або *vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**

# ЭКСКУРС У МІНУЛАЕ

Фільм-гісторыя пра багемскае шкло — на «Беларусь 1»

**Сёння ў вячэрнім эфіры глядзіце працяг дакументальнага цыкла «Лёс гігантаў». У новай серыі можна будзе даведацца ўсё пра багемскае шкло, здзейсніўшы чарговую вандроўку ў часы СССР.**

«Яго нельга чапаць, на яго можна толькі маліцца!» — гэтая фраза з вядомага фільма Эльдара Разанава «Дзяўчына без адраса» як мага лепш апісвае дэфіцыт багемскага шкла ў Савецкім Саюзе. Яго ў тыя часы можна было здабыць хіба што праз пятыя рукі і з вялікай пераплатай... У новай серыі, якую можна паглядзець адразу пасля «Панарамы», аўтары праекта сабралі самыя цікавыя факты пра багемскае шкло: унікальнае відэа, экспанаты, якія ўпершыню пакажуць у тэлеэфіры. Таксама даведаемся сакрэты шкловарэння. Нам дадуць адказы і на такія пытанні: навошта Брэжневу спатрэбілася ваза вышынёй больш за метр, чаму «сухі закон» ледзь не спыніў шклозаводы ў Саюзе і як Захад спрабаваў пераманіць нашых майстроў да сябе.

Нагадаем, усяго у новым сезоне «Лёсу гігантаў» гледачоў чакае дзесяць серый пра савецкае мінулае і яго таямніцы.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

## Пятніца, 4 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10, 22.05 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Думай як жанчына».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Паміж намі дзяўчынкамі».**
**17.35** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**18.10** Тайны следства.
**20.00 Серыял «Тальянка». Заключная серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.45** Лёс гігантаў.
**22.15 Дэтэктыў «Асабістая справа маёра Баранава».**
**0.25** Дзень спорту.
**0.35 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.10, 1.30** «Анлайн». Скетчкам.
**9.50, 16.20 Трылер «Закрытая школа».**
**11.00** «Дзённік экстрасэнса». Рэаліці-шоу.
**12.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**13.15 Дэтэктыў «Бывай, каханая». Заключная серыя.**
**14.30 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**15.30, 23.50** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.45** «Разбуральнікі міфаў».
**18.50 Выбар гледачоў. Фантастыка «Успомніць усё».**
**21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Апакаліпсіс».
**22.00** Спортлата 5 з 36, КЕНО.
**0.45** Рэпарцёр.

### Беларусь 3

**7.25** «Дабраранак».
**8.00, 11.50, 18.15, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.15, 19.15 «Вечны кліч». Драма.**
**9.40** «Камандзір з вёскі Белае». Дак. фільм.
**10.05 «Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка». Драма.**
**11.20** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака-пастаноўшчыка, сцэнографа, касцюмера, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Юрыя Тура.
**12.05** «Сіла веры».
**12.30 «Прыватнае жыццё Дон Жуана». Камедыя.**
**13.55** «Справы фамільныя». Піўная багема.
**14.25** «Мілы чалавек». Тэлеверсія спектакля.
**16.10** «Джазавая панарама». Бігбэнд Нацыянальнага аркестра пад кіраўніцтвам М. Фінберга.
**17.50** «Камертон». Галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік камернага хору Гомельскай абласной філармоніі Алена Сакалова.
**18.35, 21.00** «Героі і ахвяры халоднай вайны». Істэрыка ў асабліва буйных маштабах. Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.40 «Чырвоная палатка». Драма.**

### Беларусь 5

**7.30, 18.50, 23.00** PRO спорт. Навіны.
**7.40, 23.10** Баскетбол. НБА. «Нью-Арлеан» — «Сан-Антоніа».
**9.25** Біятлон. Чэмпіянат свету. Халменколен. Змяшаная эстафета.
**10.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**11.50** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Шосты матч.
**13.40** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Плэй-оф. Першы матч. «Ск'ёрн» (Данія) — БГК імя Мяшкова.
**15.10** Футзала. Кубак Беларусі. Фінал.
**16.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.15** «Нашы». Ірына Вяленкава.
**17.25** Спорт, спорт, спорт. Раман Петрушэнка.
**17.55** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**18.25** Піт-стоп.
**18.55** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. 1/4 фіналу. Шосты матч.
**21.05** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. 1/4 фіналу. Сёмы матч.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.35** «Бесталковыя нататкі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Міхаіл Гарбачоў. Першы і апошні».
**15.10** «Час пакажа».
**16.20 Маст. фільм «Гісторыя Асі Клячынай, якая кахала, ды не выйшла замуж».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Голас. Дзеці».
**23.00 Меладрама «Мой хлопец-псіх».**
**1.10** Легенды Live. «Elvis».
**1.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку».**
**15.35** «Вадзіць па-руску».
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Дзяўчына з Джэрсі».**
**22.05** «Глядзець усім!»
**23.00 Трылер «Сховішча».**
**0.35** «Найлепшае з залатой калекцыі СТБ»: святочны канцэрт «Вясна на СТБ».
**2.10 Маст. фільм «Дарагі Фрэнкі».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Любімыя акцёры».
**9.30 Маст. фільм «Тайна «Чорных драздоў».**
**11.20 Маст. фільм «Сувязь».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Трэш-тэст».
**13.45 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**14.15 Серыял «Развод».**
**15.10, 2.00** «Справы сямейныя».
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Хто, калі не я?».**
**19.20 Серыял «Кароткае дыханне».**
**22.50 Маст. фільм «Прыгоды жоўтага чамаданчыка».**
**0.10 Маст. фільм «Тайна «Чорных драздоў».**
**2.50 Маст. фільм «Дзённік кар'ерысткі»**.
**4.30 Маст. фільм «Музычная гісторыя».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.10** «Аляксандра Пахмутава. Адкажу за кожную ноту».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Прынцып Хабарава».**
**19.10, 20.55 Серыял «Яго каханне».**
**22.00, 23.10** «Аншлаг і Кампанія».
**0.20 Маст. фільм «Дрэнная суседка».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Месца сустрэчы».
**15.00, 16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў-12».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.45** «НЗ. Расследаванне».
**20.10 Серыял «Пчаляр».**
**21.45** «Большасць». Ток-шоу.
**22.55 Серыял «Бамбіла. Працяг».**
**1.30 Серыял «Глухар. Працяг».**

### 8 канал

**7.00, 14.10, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.30, 18.30 Серыял «Канвой».**
**9.35, 10.25, 13.55, 15.45, 16.15, 18.25, 19.35, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45** Дак. серыял «Дзікая прырода Расіі».
**10.40 Драма «Экіпаж».**
**13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.15 Серыял «Каханне і страх».**
**16.25** «Адшукваецца адпачынак».
**16.55 Серыял «Пустыня ў агні».**
**20.55** «Вечарніца».
**21.10 Баявік «Новы супергерой».**
**23.15 Серыял «Крык».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 3.30** «Лаві момант».
**6.30, 23.05, 2.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Парара».
**8.00, 13.25** Серыял «Ералаш».
**8.30** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Мамачкі».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Маладзёжка 3».
**11.30** Камедыя «Мільён для чайнікаў».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**18.00, 23.30** «Уральскія пельмені».
**21.10** Прыгоды «Авантурыст».
**0.30** «Цэнтральны мікрафон».
**1.30** Скетчкам «Студэнты».
**2.30** Скетч-шоу «Мільёны ў сетцы».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Бульдзі». Маст. фільм.
**11.40, 2.40** Сусветныя скарбы.
**12.00** «Самуіл Маршак. Звычайны геній». Дак. фільм.
**12.50** «Пісьмы з правінцыі». Калуга.
**13.20** «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм. «Шантаж». 2-я серыя.
**14.20** «Утаймаванне каня. Пётр Клот». Дак. фільм.
**15.10** Адваротны бок Месяца. «Уільям Томсан. Абсалютная велічыня». Дак. фільм.
**15.50** «Царская ложа».
**16.35, 21.55** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**17.00** «Эдгар Дэга». Дак. фільм.
**17.10** Вялікі балет.
**19.45** Смеханастальгія.
**20.20, 1.55** «Шукальнікі». «У пошуках цудатворнай статуі».
**21.05** «Дама з сабачкам». Маст. фільм.
**22.35** «Лінія жыцця». Аляксандр Дамагараў.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Партрэт пакалення. «1210». Маст. фільм.
**1.15** Канцэрт Жардзі Саваля.

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**6.55, 8.30, 9.40, 11.00, 13.00, 14.25, 15.40, 17.00, 18.45, 20.25, 21.40, 23.00, 1.05, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Адрас вашага дома».
**8.45, 14.45, 2.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока. Вечны пост». 2006 год.
**13.20** Маст. фільм «Успамін».
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Найлепшае. 2009 год.
**19.00** Маст. фільм «Нікуды не вартая».
**20.40** Дак. фільм «Мода 89-90».
**22.00** «Колба часу».
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім. «Дзеці палітычнай эліты». (І.В. Сталін)». 2007 год.
**1.20** Маст. фільм «Калі чалавек усміхнуўся».

### EuroSport 1

**3.20, 11.30, 15.00** Watts.
**3.30** Веласпорт. Тур дэ Франс. Лепшае.
**4.30, 6.00, 8.00, 13.30, 16.30, 18.45, 21.30, 2.20** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**5.00, 7.00, 10.30, 14.00, 17.00, 19.45** Біятлон. Чэмпіянат свету.
**9.00, 9.55** Футбол. Сусветныя галы.
**9.05** Футбол. Лаціна.
**9.30** Футбол. ФІФА.
**10.00, 21.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Агляд сезона.
**12.15, 15.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**18.00, 0.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**1.20** Веласпорт. Вуэльта Іспаніі. Лепшае.

### Камедыя

**0.25** Камедыя «Бос у гасцёўні».
**2.10** Камедыя «Пяць нявест».
**4.00** Камедыя «Дзіўныя сваякі».
**5.40, 21.35** Камедыя «Таксі 2».
**7.15** Камедыя «Прыгоды Падзінгтана».
**9.00** Камедыя «Таксі 4».
**10.40** Камедыя «Махляры».



**12.20** Камедыя «Парыж любой цаной».
**14.00, 14.50, 15.40, 17.40** Скетчкам «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Назад да шчасця, або Хто знойдзе сінюю птушку».
**18.00** Камедыя «Падарунак з характарам».
**19.40** Фэнтэзі «Пенелопа».
**23.05** Камедыя «Шосты элемент».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.45** «Доктар І...»
**8.15, 19.00, 1.20** «Іфет». Серыял.
**9.55, 3.50** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.45, 4.40** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.45, 16.05** «Хатні рэстаран».
**12.40, 3.05** «Нераскрытыя тайны».
**13.35, 17.55** «Пятая варта». Серыял.
**14.35, 5.30** «Псіхасаматыка».
**15.10** «Мой герой».
**17.00, 21.50** «Моцная слабая жанчына». Серыял.
**21.10** «Як выйсці замуж за тры дні». Маст. фільм.
**23.00** «Трынаццаць знакаў Задыяка».
**23.55** «Эфект матылька 2». Трылер.

### ТБ1000

**6.00, 18.05** Меладрама «Шоўк».
**8.10, 4.10** Драма «Развітальны квартэт».
**10.10** Меладрама «А вось і Полі!».
**12.10** Драма «Самы блізкі сябар».
**14.00** Меладрама «Трэцяя персона».
**16.25** Трылер «Сотавы».
**20.00** Вестэрн «Апалуза».
**22.10** Трылер «Лепшая прапанова».
**0.25** Трылер «Без кампрамісаў».
**2.05** Драма «Паўночная краіна».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Драма «Экспірыенс».
**8.20, 2.20** Камедыя «Мамы 3».
**10.20, 4.20** Баявік «Рызыка без кантракту».
**12.20** Драма «Ганна і камандор».
**14.20** Камедыя «Лёгкі на ўспамін».



**16.20** Дэтэктыў «Маша і мора».
**20.20** Трагікамедыя «Коля — перакаці-поле».
**22.20** Камедыя «Каўказская палонніца!».
**0.20** Баявік «Спіраль».

### National Geographic

**6.00, 5.35** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.40, 15.30, 17.55** Сіла племені.
**8.25, 18.40** Па слядах міфічных пачвар.
**9.15, 14.00, 19.30** Каралі шахт.
**10.00, 14.45, 20.15** Верф.
**10.50** Дзікі тунец.
**11.35** Ледзяная дарога.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**13.10, 0.05** Зрабі або памры.
**13.35, 0.30** Навуковыя недарэчнасці.
**16.20** У пошуках плямёнаў паляўнічых.
**17.10** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 0.50, 4.00** Золата ў халоднай вадзе.
**21.45, 1.40, 4.50** Інстынкт выжывання.
**22.30, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**23.20, 2.25** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00, 12.30** Мяцежны гараж.
**8.50, 1.00** Трой.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**11.35, 7.10** Уцячы ад пагоні.
**12.30** Мяцежны гараж.
**13.25, 6.25** Космас навыварат.
**15.15, 5.40** Дарожныя каўбоі.
**16.10, 3.00** Вялікі махінатар.
**18.00** Паляванне на труфелі.
**19.00** Паляўнічыя на рачныя дыяменты.
**20.00** Залатая ліхаманка.
**22.00** Чыгунка Аляскі.
**23.00** Аляска: апошняя мяжа.
**0.00** Апошнія жыхары Аляскі.
**2.00, 4.50** Паляўнічыя на склады.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

**29 марта 2016 г.**

**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОТЧЕТНО-ВЫБОРНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

# ОАО «Камволь»

**Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176 , конференц-зал, 4 этаж главного корпуса.**

## ПОВЕСТКА ДНЯ:

**1. Отчет о финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2015 г. и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год.**

***Докладчик: генеральный директор – Жаборт А.Г.***

**2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2015 году.**

***Докладчик: председатель наблюдательного совета – Лапченко И.С.***

**3. Отчет о работе ревизионной комиссии в 2015 году.**

***Докладчик: председатель ревизионной комиссии.***

**4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.**

***Докладчик: и.о. главного бухгалтера – Борисёнок Ю.М.***

**5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2015 год.**

***Докладчик: зам. генерального директора по экономическим вопросам – Руниo С.А.***

**6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2016 год и первый квартал 2017 года.**

***Докладчик: зам. генерального директора по экономическим вопросам – Рунцо С.А.***

**7. Утверждение Устава Общества в новой редакции.**

***Докладчик: начальник юридического бюро – Столярова Е.В.***

**8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.**

**9. Утверждение размеров вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.**

***Докладчик: начальник ООТиЗ – Михновец Л.В.***

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу:
**г. Минск, ул. Маяковского, 176, тел.: 223 14 20, 2-97.**

Начало работы собрания **10.00**.

Регистрация участников собрания **с 9.30 до 10.00.**

*Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2016 года.*

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393

***Уважаемые акционеры ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»! (223610, г. Слуцк, Минская область, ул. Головащенко, 6)***

**Во Дворце культуры сахарорафинадного комбината**

**30 марта 2016 года в 14.00**

**по адресу: г. Слуцк, Минская область, ул. Головащенко, 6 СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ ГОДОВОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ открытого акционерного общества**

# «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1.** Отчет о результатах деятельности Общества за 2015 год и направлениях развития на 2016 год:

- *Отчет Дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2015 году и основных направлениях деятельности Общества на 2016 год;*
- *Отчет Наблюдательного Совета о проделанной работе;*
- *Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии в 2015 году и заключение по бухгалтерскому балансу и годовому отчету Общества;*
- *Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2015 год с учетом аудиторского заключения;*
- *Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2015 год.*

**2.** Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2016 год.

**3.** Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2015 год, порядка и сроков выплаты дивидендов по 2016 году.

**4.** Утверждение размера, условий вознаграждения и компенсации расходов за исполнение своих обязанностей членам Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.

**5.** Избрание членов Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии Общества.

**6.** О даче согласия на увеличение уставного фонда СУП «Агросервис-ССК» путем передачи на его баланс свеклоуборочного комбайна «HOLMER».

**7.** О даче согласия на увеличение уставного фонда ПУП «Стародорожский плодоовощной завод» путем внесения на его баланс денежного вклада в размере 33 000 000 000 (тридцати трех миллиардов) белорусских рублей.

**8.** О даче принципиального согласия на реорганизацию ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат» путем присоединения к нему ОАО «Преснаки» и ОАО «Суворова-Агро» Копыльского района.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составляется на 01.03.2016 года.

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 13.00 до 14.00 по месту его проведения.

Время и место ознакомления с материалами, предоставляемыми для ознакомления лицам, имеющим право на участие в общем собрании: в рабочие дни начиная **с 11.03.2016 г. по 30.03.2016 г.** по месту нахождения Общества с 8.00 до 17.00 (ул. Головащенко, 6, холл второго этажа) или по тел. 801795-45328, а в день его проведения – по месту проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам – паспорт.

***Дирекция, Наблюдательный Совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».***

УНП 600075003

Утеряна круглая печать Общества с ограниченной ответственностью «Торгово-промышленная группа «Ростехком», УНП 192461093. Печать считать недействительной.

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ**

# ОАО «Стройтрест № 1»

**28 марта 2016 г. в 14.30**

**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 1» по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 15**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год и основные направления деятельности Общества на 2016 год.
2. Отчет о работе наблюдательного совета Общества в 2015 году. Оценка деятельности генерального директора Общества наблюдательным советом.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2015 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2015 год. О выплате дивидендов за 2015 год.
6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2016 год и первый квартал 2017 года. Периодичность выплаты дивидендов в 2016 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в очередном общем собрании акционеров, – 22 марта 2016 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться в рабочие дни с 21 по 28 марта 2016 г. с 9.00 до 18.00 с перерывом с 13.00 до 14.00 по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Платонова, 15; в день проведения собрания – по месту его проведения с 9.00 до 13.00.

Регистрация участников собрания с 13.30 до 14.00.

Для регистрации при себе иметь: акционеру Общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.

Начало работы собрания в 14.30.

УНП 100288960

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | | |
| **Продавец** | **ОАО «Гродненская обувная фабрика «Неман», г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95** | | | |
| **Предмет аукциона** | | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| **Столовая** | **Помещение общественного питания** | **2953,9 кв.м** | **400/D-150913** | **г. Гродно, ул. Гагарина, д. 41-1** |
| **Обременения:** договор аренды сроком до 01.12.2018, арендуемая площадь – 743,9 кв.м (ресторан «Топаз»); договор аренды сроком по 31.12.2017, арендуемая площадь – 102 кв.м (участок кровли для размещения оборудования и антенн базовой станции сотовой связи) | | | | |
| **Сведения о земельном участке**: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования пл. 0,4389 га для эксплуатации и обслуживания здания столовой | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 11 173 440 000 белорусских рублей (снижена на 20%)** | | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | |
| *Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.12.2015 г.* | | | | |
| **Аукцион состоится 18.03.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 17.03.2016 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by | | | | |

**Отчёт об использовании имущества Местного культурного фонда «Традиция»**

Местный культурный фонд «Традиция», зарегистрированный Главным Управлением юстиции Мингорисполкома 13 января 2010 года, создан одним учредителем.

Фонду учредителем при создании было передано имущество на сумму 3 545 000 (Три миллиона пятьсот сорок пять тысяч) белорусских рублей. За отчётный период учредителем было передано фонду имущество на сумму 7 480 000 (Семь миллионов четыреста восемьдесят тысяч) белорусских рублей. С учётом переоценки стоимость основных средств составляет 28 874 365 (Двадцать восемь миллионов восемьсот семьдесят четыре тысячи триста шестьдесят пять рублей). Предпринимательская деятельность фондом не осуществлялась.

За отчётный период с привлечением волонтёров и силами учредителя редактировался портал об исторической реконструкции в Беларуси. Также указанными силами был осуществлён ряд культурных мероприятий совместно с клубом исторической реконструкции «Гивойт» при ГУО «ЦДО ДиМ «Эврика» в школах-интернатах и детских домах Беларуси. Учредителем фонда уплачивается арендная плата в размере 250 (двести пятьдесят) тысяч белорусских рублей. Иных расходов за отчётный период фонд не имел.

Унитарных предприятий, хозяйственных обществ фондом не создавалось, также фонд не участвует в таких юридических лицах.

*11 января 2016 г.* *Директор* *В.Е. Личко* УНП 194901372

**ОТЧЕТ**

**Международного фонда развития сельских территорий об использовании своего имущества (далее – Фонд) за 2015 год**

Количество учредителей Фонда – 9, из них 8 – физические лица.

Информация о стоимости имущества Фонда:

- стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет 43 650 000 белорусских рублей;

- поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с уставом Фонда (целевое финансирование), составляют 573 080 100 белорусских рублей, 51 266 долларов США и 26 375 евро;

- поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 70 298 581 белорусских рублей;

- доходов от предпринимательской деятельности, осуществляемой Фондом, – 52 245 883 белорусских рублей.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей согласно Уставу Фонда составила 1 369 710 358 белорусских рублей.

Фонд имеет филиал, расположенный на территории Французской Республики по адресу: д. 5, улица Жозеф и Мари Хакин, 75116 Париж.

Фонд является участником потребительского кооператива «Республиканский микрофинансовый центр», Протокол Правления фонда № 5 от 23.06.2009 г., и соучредителем местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация», Протокол Правления фонда № 19 от 16 февраля 2016 года.

Фонд не является учредителем иных унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.

УНП 805000817

■ Неасабісты суб'ектыў



# Пахаваем сябе за плінтусам?

## Аматарам каментаваць «сенсацыі» прысвячаецца

ЯК любілі пісаць нашы папярэднікі ў журналістыцы, — «зачапіла!» Гэта я пра навіну, якую спачатку растыражавалі нашы суседзі, а ўслед за імі падхапілі і айчынныя інтэрнэт-рэсурсы (прычым, здаецца, не без задавальнення). «Найгоршым горадам Еўропы аказаўся Мінск...» «Мінск прызналі найгоршым горадам Еўропы для жыцця...» — не асабліва цікавячыся падрабязнасцямі, яны перадрукавалі гэта паведамленне слова ў слова, у чым пераканалася, забіўшы ў пошукавую сістэму гэтую фразу. «Сенсацыя» ў такім выглядзе мяне, мякка кажучы, не задаволіла, бо трэба ж зразумець, адкуль у яе «ногі растуць».

Аказваецца, рэйтынг, у які патрапіла наша сталіца, штогод складае брытанская кансалтынгавая кампанія Mercer (са штаб-кватэрай у Нью-Ёрку). Па якасці жыцця яны паставілі Мінск на 190 месца сярод 440 гарадоў свету, аб чым і паспяшаліся паведаміць у сваім прэс-рэлізе. Згодна з метадалогіяй, апублікаванай на афіцыйным рэсурсе кампаніі, паняцце «якасць жыцця» яны вызначаюць аж па 39 фактарах, якія дзеляцца на 10 катэгорый. Сярод іх — бяспека, даступнасць медыцыны і адукацыі, развіццё транспарту і інфраструктуры для адпачынку, наяўнасць і даступнасць спажывецкіх тавараў, банкаўскіх паслуг... Чым далей чытаеш, тым больш здзіўляешся. Нават не крыўдзішся, бо разумееш, што ацэнку па названых крытэрыях у дачыненні да нашага горада шаноўныя спецыялісты паважанай кампаніі рабілі яўна на адлегласці ў некалькі тысяч кіламетраў, спасылаючыся на паведамленні «добразычліўцаў».

Увогуле, той прэс-рэліз даволі скупы на інфармацыю — у ім толькі лідары і аўтсайдары. Напрыклад, там няма Берліна. Вельмі цікава было б дакладна ведаць нумар пазіцыі гэтага горада. Хоць і так зразумела, што сталіцу Германіі «ў хвост» не паставяць...

ЗРЭШТЫ, мы не пра палітыку, а пра якасць жыцця і яго складнікі. У Берліне я апошнія гады бываю даволі часта і не па адным дні. Прычым не як уражлівы турыст — жыву ў сяброў у раёне горада, адкуль Брандэнбургскіх варот не відаць. І калі першае захапленне «Гэта ж я ў Еўропе!» (і адкуль толькі яно ў нас бярэцца?) знікае і ўключаюцца мазгі, пачынаеш заўважаць побытавыя рэчы, для жыхара «найгоршага горада Еўропы» нязвыклыя і незразумелыя.

На маіх вачах, напрыклад, чалавек ледзь не згарэў ад запалення лёгкіх. 40-гадовы мужчына, які палову сваёй зарплаты аддае на медыцынскую страхоўку, з тэмпературай 39 пайшоў да ўрача. Тая паслухала, выпісала нейкі гамеапатычны прэпарат, параіла папіць... біяёгурту. Ад такога лячэння хвораму лепш не стала, не ратаваў ужо і прывезены з Мінска парацэтамол (там без рэцэпта не купіш нават аспірын), і ён, ужо задыхаючыся, зноў пасунуўся да таго ж доктара. Яго адправілі на рэнтген у суседні квартал, «самаходам» — хворы сам выклікаў таксі. Толькі калі рэнтген паказаў двухбаковае запушчанае запаленне, яму выпісалі антыбіётыкі і адправілі дадому. Як вы ўжо зразумелі, таксі ён зноў выклікаў сам. Праваляўся дома месяц — «не было падстаў для шпіталізацыі». Дзякуй Богу, моцны яшчэ арганізм з хваробай справіўся.

Шасцігадовую дзяўчынку бацькі захацелі аддаць у школу з французскай мовай навучання. Малая паспяхова здала ўсе тэсты. Але колькасць месцаў у класе строга абмежаваная, ахвотных было больш. Машу не прынялі, а дзяўчынку, якая паказала тыя ж вынікі, узялі. Бо маці ў яе француженка, а ў Машы — беларуска... Праўда, дзяўчынка сёння вучыцца ў той школе, але гэта каштавала дзве тысячы еўра — столькі яе бацька заплаціў адвакату, які дапамог уладзіць справу.

Я ведаю, што на адной са станцый восьмай лініі метро, асабліва ўвечары, лепш не выходзіць, бо там збіраюцца мясцовыя наркаманы, аб чым сведчаць размаляваныя сцены і выкарыстаныя шпрыцы на падлозе. А ў пераходзе з надземнай часткі метро на тую самую восьмую лінію падземкі ўжо каторы год жыве бяздомны са сваімі двума вялізнымі сабакамі. У метро няма турнікетаў, няма персаналу і паліцыі, стаяць толькі аўтаматы для продажу білетаў. Таму сказаць пра тое, што ў ім бяспечна, сёння, напэўна, не асмеляцца нават самыя патрыятычна настроеныя жыхары нямецкай сталіцы,

ЯШЧЭ можна згадаць непрыбраныя вуліцы, на якіх звычайная з'ява не толькі смецце, але і выкінутая з дамоў старая мэбля. Няма каму прыбіраць, і гэта прытым, што ў кожным скверы, у кожнай кавярні — беспрацоўныя лайдакі (у большасці мігранты), якія нядрэнна сябе пачуваюць, жывучы на дапамогу, што атрымліваюць ад дзяржавы. «У нас дэмакратыя, гэта іх выбар — быць беспрацоўнымі», — тлумачылі мне месцічы, калі задала пытанне, чаму б гэтым маладым ды зраровым не даць у рукі венік ці граблі... Я ўжо не кажу пра цэлыя зграі беспародных сабак, якія тыя ж беспрацоўныя выгульваюць па вуліцах. (За кожную жывёліну належыць яшчэ пэўная даплата да дапамогі.) І ніводнага з іх я не бачыла з шуфлікам і пакецікам, затое кожны раз на парозе дома даводзіцца хвілін пяць адчышчаць падэшвы...

Цікава, на якім усё-ткі месцы ў тым рэйтынгу Берлін?..

ЗРЭШТЫ, я не пра палітыку. (Хоць тут можна сказаць, што той рэйтынг і наша месца ў ім — «даважак» да санкцый, якія перасталі быць актуальнымі для Еўрасаюза ўсяго некалькі тыдняў таму.) А цяпер нават і не пра якасць жыцця. Ва ўсёй гэтай гісторыі найбольш зачапілі не вынікі таго даследавання, а рэакцыя на іх у інтэрнэт-каментарыях. Прычым суседзі нашы ў большасці сваёй сталі на абарону Мінска, а нашы суайчыннікі... узрадаваліся. Захоплена абмяркоўваючы «сенсацыю» на старонках асобных «патрыятычных» рэсурсаў», яны нібы спаборнічаюць у дасціпнасці — хто больш бруду вылье, хто больш апаганіць. А тыя, хто спрабуе запярэчыць, нібы саромеюцца ці баяцца чагосьці, і каментарыі іх пачынаюцца прыкладна так: «І праўда, Мінск не найлепшы горад, але ж...»

Задаволена пляскаць у ладкі або вінавата апраўдвацца кожны раз, калі бэсцяць і паліваюць брудам калі не цябе асабіста, дык тваю радзіму, у нашай інтэрнэт-супольцы стала ледзь не модным. Калі ўлічыць, што сеціва — самая даступная крыніца інфармацыі для тых жа кампаній, што праводзяць рознага кшталту даследаванні, чаму тады здзіўляцца? Як мыслім, тое і маем.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■ На парадку дня

# ДЗЕЛЯ ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

**Праграма развіцця Арганізацыі Аб'яднаных Нацый адзначае ў лютым сваё 50-годдзе. У Нью-Ёрку з гэтай нагоды адбудзецца нарада міністраў, дзе абмяркуюць Парадак дня да 2030 года. Гаворка пойдзе пра выкараненне беднасці, зніжэнне няроўнасці, павышэнне якасці дзяржаўнага кіравання, ахову навакольнага асяроддзя, папярэджванне зменаў клімату, умацаванне сацыяльных перадумоў здароўя.**

Паводле слоў **Пастаяннага прадстаўніка ПРААН у Беларусі Санакі САМАРАСІНХІ,** ад самага пачатку прысутнасці ў Беларусі, з 1992 года, наша дзяржава атрымлівала дастатковае фінансаванне ад самых розных партнёраў (такіх, як Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй, Глабальны экалагічны фонд) і краін (Швецыя, ЗША, Расія, Швейцарыя, Данія, Японія, Фінляндыя і інш).

У Беларусі былі рэалізаваныя самыя розныя ініцыятывы. Гэта праграмы ў галіне лідарства і гендарнай роўнасці, прытулак для ахвяр гандлю людзьмі, «гарачая лінія» па прадастаўленні інфармацыі для бяспечнага выезду за мяжу. Акрамя таго — стварэнне бізнес-інкубатараў і крэдытных саюзаў, укараненне мікрафінансавання як новага механізму падтрымкі малога бізнесу, адкрыццё цэнтраў па развіцці сельскага прадпрымальніцтва. Фінансаваліся праекты ў рэгіёнах, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. 146 мясцовых ініцыятыў у пацярпелых ад аварыі раёнах атрымалі падтрымку на агульную суму каля 9 млн еўра.

«Сёння перад Беларуссю паўстаюць новыя выклікі, але яны звязаны ў цэлым з сітуацыяй у свеце, і краіна можа іх пераадолець, калі будзе рухацца наперад», — заўважыў Санака Самарасінха.

У 2016—2020 гадах ПРААН у Беларусі скіруе намаганні на ўстойлівае эканамічнае развіццё, адказнае і падсправаздачнае кіраванне, захаванне спрыяльнага навакольнага асяроддзя і ўкараненне прынцыпаў «зялёнай» эканомікі, забеспячэнне доступу насельніцтва да шырокага спектра сацыяльных паслуг і прасоўвання здаровага ладу жыцця, падтрымку сацыяльна ўразлівых катэгорый насельніцтва (маламаёмных, інвалідаў, моладзі і пажылых).

— Беларусь была першай краінай СНД, якая адкрыла ў сябе прадстаўніцтва ААН, — нагадаў на ўрачыстым мерапрыемстве **намеснік міністра замежных спраў Беларусі Валянцін РЫБАКОЎ.** — Нягледзячы на дасягненне значных поспехаў у нашым узаемадзеянні, наперадзе нас чакае маштабная сумесная работа, звязаная з рэалізацыяй мэт устойлівага развіцця.

**Святлана ПРОТАС.** *protas@zviazda.by*

■ Погляд

# ПРАКЛЁН ГЕРОЯЎ ЦІ ГЕРАІЗАЦЫЯ ПРАКЛЯТЫХ?

## Па слядах польскага гістарычнага міфа Арміі Краёвай

Гістарычная палітыка стала сёння адной з тых сфер, дзе дзейнасць партыйных лідараў і дзяржаўных устаноў вядзецца, напэўна, найбольш актыўна. Асабліва гэта датычыцца Усходняй Еўропы. Гэта звязана як з неабходнасцю пошуку ідэнтычнасці кожнай з краін былога СССР і Варшаўскага дагавора ў новых геапалітычных умовах, так і са спробамі знайсці ўласнае мінулае і падмурак для асэнсавання сябе як нацыянальнай супольнасці.

Будуючы ўласную гісторыю, краіны не толькі пераасэнсоўваюць мінулае і шукаюць герояў і антыгерояў, але і ствараюць сапраўдныя міфы, якія абгрунтоўваюць нацыянальны і, калі жадаеце, «дзяржаўніцкі» погляд на тую ці іншую падзею ці постаць. Гэтыя міфы не проста прапануюць спрошчаную выяву мінуўшчыны, але нават у некаторых аспектах (якія на першы погляд здаюцца не асабліва істотнымі) скажаюць яе дзякуючы «бездакорнай логіцы».

